Водзыў аб дысертацыі Т. Л. Канстанцінавай
«Абходныя песенна-віншавальныя традыцыі ў каляндарна-абрадавым цыкле Паўночнай Беларусі»

Здзейснены ў дысертацыі досвед спецыяльнага даследавання песенна-віншавальных абходаў каляндарнага цыкла Паўночнай Беларусі з'яўляецца *першым* у славістычным этнамузыказнаўстве і належыць магістральнаму для сусветнай народазнаўчай навукі кірунку вывучэння традыцыйных музычных культур у геаграфічнай разнастайнасці іх абрадавых форм.

Маштабнасць *аб'екта*, захаванага ў «вялікім часе» і этасе этнапесеннай культуры беларусаў у якасці звязанага з сакральна значнымі ўстанаўленнямі традыцыйнай свядомасці, вызначае ўваход дысертацыйнай працы ў рэчышча *фундаментальнай* этнамузыкалагічнай навукі.

Узроўню фундаментальнасці адпавядае міждысцплінарная і кампаратывісцкая скіраванасць даследавання, шырыня яго праблемнага поля, актуальнасць метадалогіі і навуковых задач, вырашэнне іх на стыку народазнаўчых і ўніверсальных для этнамузыказнаўства метадаў структурна-тыпалагічнага, функцыянальнага, картаграфічнага, арэальнага і музычна-стылістычнага аналізу.

Фундаментальны профіль дысертацыі акрэсліваецца рэалізацыяй у ёй новай для этнамузыказнаўства *канцэпцыі музычнай арэалогіі,* разгортваннем сінхроннага і дыяхроннага аналізу песенна-віншавальнага абрадавага матэрыялу з улікам спецыфічнасці этнакультурнага «рэльефу» паўночнабеларускага рэгіёна як медыяльнага на стыку славянскай, балцкай і фіна-угорскай прастор.

Стрыжнёвым у дысертацыі выступае падыход да рытуалу як *комплексу* элементаў, якія незалежна ад часавых і геаграфічных лакацый абрадавых форм знаходзяцца ў рухомым узаемадзеянні і ўтвараюць *сістэму адкрытага тыпу.*

У межах сістэмнай парадыгмы знаходзяцца ўсе тэарэтычныя палажэнні даследавання, іх аргументацыя і скіраванасць навуковых задач.

Да ліку прынцыповых дасягненняў дысертацыі належыць распрацоўка *тэорыі рытуала*, дэфініцыі паняцця «абход» і класіфікацыя іх відаў, выяўленне ролі абхода як *сістэмаўтваральнага элемента* паўночнабеларускага каляндарна-абрадавага цыкла, ажыццяўленне цалкам *новага* па падыходзе картаграфавання абходна-віншавальных калядных і валачобных напеваў з устанаўленнем *крос-рэгіянальнага* характару іх арэалаў, вызначэннем структуры і гісторыка-культурнай інтэрпрэтацыяй канфігурацыі.

Праз створаную *поўнаметражную тыпалогію* песеннага напаўнення калядных і валачобных напеваў, выяўленне спецыфікі абрадавых дзей у святле гістарычнай, функцыянальнай, акцыянальнай, жанравай і арэальнай *дынамікі* іх песеннага кампанента, шматскладаны корпус песенна-віншавальных абрадавых абходаў каляндарнага цыкла раскрываецца як самы вялікі і значны ў песеннай традыцыі Паўночнай Беларусі.

*Адкрыццём* з'яўляецца даказаная на ўзроўні абходна-песенных віншавальных практык архаічнага генезісу глыбінная сувязь этнакультурных традыцый на тэрыторыях Беларускага і Рускага Паазер'я і ўстаноўленне старажытнай тэрыторыі крывічоў заходнядзвінскага правабярэжжа ў якасці *цэнтра* паўночнабеларускага каляднага і валачобнага песеннага масіву.

Надзвычай маштабны, падрабязна дакументаваны экспедыцыйна-палявы музычны і этнаграфічны матэрыял, зафіксаваны ў жывых рэаліях XX–XXI стст. і пададзены ў падрабязных нотных і вербальных транскрыпцыях, па-новаму высвечвае паўночнабеларускую песенна-віншавальную каляндарную абраднасць, яе аб'ём і перспектывы вывучэння.

Даследчыя працы Т. Канстанцінавай аб песенна-віншавальных абходных рытуалах каляндарнага цыкла Паўночнай Беларусі дастаткова добра вядомыя навуковай супольнасці праз прэзентацыі іх канцэптуальных палажэнняў, метадалагічных пазіцый і аналітычных высноў у айчынных і замежных выданнях і на міжнародных форумах. У фармаце дысертацыі яны паўстаюць на ўзроўні комплекснага, буйнога і высокага па выніках даследавання, якое заслугоўвае ўсебаковага асэнсавання, дае магчымасць недасягальнага раней паглыблення ў сферу этнапесеннай культуры беларусаў і фарміруе такі ракурс яе сістэмнага ведання, які моцна ўздзейнічае на многія галіны народазнаўства і этнамузыкалогіі, стымулюе паварот у метадалогіі і ўстаялых парадыгмах вывучэння глыбінных абрадавых форм і складана арганізаваных ландшафтаў традыцыйных песенных культур.

Навуковы кіраўнік –
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт Т. С. Якіменка